ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 1 2003
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

# ГІСТОРЫЯ

*УДК 947.6*

*С. Я. НОВІКАЎ*

## СУЧАСНАЯ ГЕРМАНСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ АБ НАЦЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ БЕЛАРУСІ

*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 22.01.2002)*

Навуковую карціну сучаснай германскай гістарыяграфіі вызначаюць даследчыя тэндэнцыі, якія выразна акрэсліліся на працягу апошняга дзесяцігоддзя. Навацыі сталі вынікам змены старых метадалагічных установак і замацавання альтэрнатыўных падыходаў, скіраваных на пошук новых форм грамадскага асэнсавання і адэкватных навуковых ацэнак праблем другой сусветнай вайны.

Характэрным для германскіх даследаванняў 1990-х было тое, што сярод агульнай праблематыкі трывала замацаваліся тэмы, якія наблізілі замежных навукоўцаў да глыбокага, прынцыповага і аб'ектыўнага вывучэння гісторыі нацысцкай акупацыі Беларусі [3; 6; 7; 9—11; 13]. Такі падыход тлумачыўся, па-першае, наяўнасцю навуковай патрэбы ў пераасэнсаванні існуючых раней ацэнак у дачыненні да форм, зместу і характару дзейнасці як ваеннай, так і цывільнай адміністрацыі ў акупаванай Беларусі; па-другое, фарміраваннем нараўне з традыцыйнай школай ваенных гісторыкаў новай школы даследчыкаў — гісторыі вайны ці гісторыі людзей; па-трэцяе, доступам да раней невядомых першакрыніц, магчымасцю іх поўнай археаграфічнай, тэксталагічнай і навуковай апрацоўкі.

Падмуркам для разгляду трагічных падзей, якія пачаліся для беларускага народа 22 чэрвеня 1941 г. і доўжыліся больш тысячы дзён і начэй, з'яўляюцца выданні сучаснай германскай гістарыяграфіі. Найноўшым з іх застаецца праца «Hitlers Krieg im Osten 1941—1945» («Вайна Гітлера на ўсходзе 1941—1945». Пераклад аўтара. — *С. Н.*), што летам 2000 г. стала на паліцы германскіх кнігарняў дзякуючы намаганням навуковага дырэктара Цэнтра ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме доктара Рольфа-Дзітэра Мюлера і навуковага супрацоўніка Федэральнага ваеннага архіва ў Фрайбургу доктара Герда Юбершэра. Згадаем, што беларускім гісторыкам вядомы іх папярэдні англамоўны збор, які, як адзначаюць самі аўтары, быў грунтоўна перапрацаваны для новага нямецкамоўнага выдання пад вуглом крытычнага аналізу шырокага кола сусветнай гістарыяграфіі па праблеме гісторыі другой сусветнай вайны і вайны Гітлера на Усходзе [12].

Вызначаючы навуковую і гістарычную сутнасць апошняй, Р.-Д. Мюлер і Г. Р. Юбершэр у сваёй працы засяроджваюць увагу на новым бачанні праблемы, паколькі сённяшні ўзровень даследаванняў акрэсліваецца праз рознабаковае, цэласнае і сістэмнае вывучэнне ваеннай гісторыі: не столькі гісторыі ваенных аперацый, колькі ўсяго спектра знешніх, унутраных, палітычных, эканамічных, грамадскіх і іншых падзей [12, c. IX]. З улікам менавіта гэтых момантаў аўтары спрабуюць наблізіцца да пераасэнсавання як вайны Гітлера на Усходзе ўвогуле, так і акупацыйнай палітыкі ў Беларусі ў прыватнасці.

У новай гістарыяграфічнай працы яе аўтары, тым не менш, не пакідаюць па-за межамі свайго разгляду і традыцыйныя падыходы да праблемы ўсходняй палітыкі нацысцкай Германіі. Вывучэнне яе ў пасляваенныя гады вельмі часта прыводзіла навукоўцаў да параўнаўча-гістарычнага аналізу першай і другой сусветнай войнаў, іх маштабу, характару, асаблівасцей і г. д. Аднак аўтары новага гістарыяграфічнага выдання, разглядаючы важнейшыя публікацыі па гэтай тэматыцы, заўважаюць, што такі падыход не прыводзіць да чакаемага выніку, паколькі характар нацысцкай акупацыйнай палітыкі на Усходзе не падлягае параўнанню ў сувязі з тым, што выступае як унікальная з'ява гісторыі «Трэцяга рэйха Гітлера» [12, с. 310]. З самага пачатку ён праводзіў вайну на прыгнёт і вынішчэнне — татальную вайну, аналаг якой адсутнічаў у

папярэдняй гісторыі Еўропы. Адмысловымі былі і метады нацысцкага акупацыйнага рэжыму, скіраваныя на дасягненне жудаснай мэты: правесці вар'яцкі эксперымент па стварэнні не толькі новай жыццёвай прасторы, колькі радыкальнай змены ўсяго гаспадарчага і сацыяльнага ладу, а таксама — селекцыі мясцовага насельніцтва паводле расавых і палітычных прыкмет, яго перасялення, выгнання і вынішчэння [12, с. 311].

На думку Р.-Д. Мюлера і Г. Р. Юбершэра, для разгледжанай імі літаратуры па гэтай праблеме было характэрным у асноўным традыцыйнае вывучэнне гісторыі акупацыйнага рэжыму, у цэнтры палітыкі якога знаходзілася ідэя планавых забойстваў мірнага насельніцтва. З самага пачатку вайны Гітлера на Усходзе яно трапляла да ліку ахвяр, аднак не ў сувязі з ваеннымі аперацыямі, а ў рамках гіганцкай праграмы запланаваных забойстваў. Часткова апошнія вынікалі з планаў каланізацыі і германізацыі ўсходняй тэрыторыі. Але канкрэтныя рамкі для ўсяго гэтага вызначаліся так званым генеральным планам Ост. У адпаведнасці з ім нямецкія акупацыйныя органы разглядалі мясцовае насельніцтва, падзяляючы яго па расавай прыкмеце, у выніку чаго былі вызначаны катэгорыі людзей, якія адразу траплялі да «непажаданых» і «непатрэбных», каго трэба было замарыць голадам, вынішчыць ці проста ліквідаваць [12].

Сучасная пазіцыя нямецкіх даследчыкаў знайшла сваё замацаванне ў навуковай канцэпцыі, сутнасць якой заключаецца ў тым, што заваёва Усходу з самага пачатку вайны разглядалася вышэйшым кіраўніцтвам трэцяга рэйха як аснова для яго будучага сусветнага не толькі палітычнага, але і эканамічнага панавання [12, с. 312]. Таму на захопленай тэрыторыі Беларусі форма, змест і характар дзейнасці акупацыйнага рэжыму вызначаліся ў адпаведнасці з дырэктывамі вышэйшага кіраўніцтва, а таксама з улікам уласных інтарэсаў вермахта, войскаў СС, гаспадарчых службаў і цывільнага кіравання [12]. Заўважым ад сябе, што аўтары новага выдання невыпадкова ў гэтым пераліку аддаюць трэцяе месца службам Г. Герынга. Пад уплывам аб'ектыўных фактаў аўтары вымушаны канстатаваць менавіта такі расклад сіл, паказаць месца і вызначыць ролю кожнай з іх у дырэктывах, праграмах, планах акупацыі Усходу.

Як адзначана ў разглядаемым выданні, навуковая класіфікацыя ўсёй усходняй акупацыйнай палітыкі пачалася разам з выхадам апошніх трох тамоў вядомай дзесяцітомнай серыі «Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg». Сістэматызаваны падыход да нямецкай акупацыйнай палітыкі пачынаецца ў 1983 годзе з выхадам чацвёртага тома [4], у якім на багатым фактычным матэрыяле была практычна поўнасцю паўторана старая, хаця значна паглыбленая і пашыраная за кошт новых дакументальных матэрыялаў, канцэпцыя амерыканскага даследчыка А. Даліна. У дзвюх апошніх фундаментальных кнігах пятага выдання знайшла адлюстраванне праграма расавай і ідэалагічнай вайны, эканамічная палітыка і палітыка на вынішчэнне мірнага насельніцтва, ваеннапалонных і г. д. Зазначым, што апошні том пабачыў свет толькі ў 1999 годзе і завяршыў разгляд акупацыйнай палітыкі на Усходзе.

Ключавой праблемай, якая ў апошняе дзесяцігоддзе набыла значны інтарэс сярод прафесійных даследчыкаў, на думку Р.-Д. Мюлера і Г. Р. Юбершэра, можна лічыць тэму аб ролі вермахта ў другой сусветнай вайне і ў сістэме акупацыйнага рэжыму ў Беларусі [12, с. 228]. Як вядома, разгляд гэтага прынцыповага пытання ў ФРГ з'явіўся жорсткім выпрабаваннем для ўсяго грамадства, а не толькі для навукоўцаў-гісторыкаў. Прычым на старонкі германскай гістарыяграфіі праблема аб злачынствах вермахта ўпершыню трапляе толькі ўвосень 1991 года дзякуючы таму, што некаторыя навукоўцы рашуча адышлі ад старых падыходаў і імкнуліся весці свой даследчыцкі пошук у адпаведнасці з гістарычнай праўдай. Аб'ектыўны адказ на гэта пытанне азначаў крах міфа аб «чыстым вермахце», садзейнічаў прарыву ў масавай свядомасці і ліквідацыі апошняга «табу з часоў нацызму» [5, с. 9].

Пераасэнсаванне гістарычнага мінулага на прыкладзе высвятлення сапраўднай ролі вермахта ў ажыццяўленні злачыннай акупацыйнай палітыкі ў гады другой сусветнай вайны — задача, над вырашэннем якой у 1990-я таксама працавалі вучоныя Гамбургскага інстытута сацыяльных даследаванняў. Вынікам іх напружанай працы, у першую чаргу з новымі дакументальнымі крыніцамі, з'явілася фундаментальнае выданне — збор матэрыялаў міжнароднага калектыву даследчыкаў пад агульнай назвай «Vernichtungskrieg. Verbrechen der Wehrmacht 1941 bis 1944» (Hamburg, 1995). Заўважым, што на працягу апошняга часу адбылося звыш 10 перавыданняў гэтай працы, часткова вядомай і беларускаму чытачу. У выданні знайшлі адлюстраванне новыя, нетрадыцыйныя падыходы да асвятлення характару дзейнасці вермахта як аднаго з непасрэдных выканаўцаў злачынных загадаў на акупаванай тэрыторыі краін Еўропы, СССР і Беларусі [8].

Такія падыходы, да якіх прыйшлі даследчыкі ў Гамбургскім цэнтры, знайшлі сваё адлюстраванне не толькі ў навуковых выданнях, але і ў новай канцэпцыі папулярызацыі ведаў праз

виставу фотадакументаў [1, с. 107; 13]. Апошняя была арганізавана ўвесну 1995 года і адразу ператварылася ў форму наглядната распаўсюджвання праўды пра вермахт, гісторыю яго злачынстваў на прыкладзе акупаваных краін практычна з усёй Еўропы. Пасля знаёмства з экспанатамі выставы яе наведвальнікі наглядна пераконваліся, хаця і не заўсёды, што нямецкі акупацыйны рэжым яшчэ да пачатку вайны планаваўся як сістэма масавага вынішчэння, ключавую ролю ў якой поруч з войскамі СС, паліцыяй, зондэркамандамі выконвалі ўзброеныя сілы нацысцкай Германіі — вермахт. Аднак навуковы шлях да гістарычнай праўды заняў у самой Германіі амаль 15 гадоў, калі ўявіць пры гэтым, што вермахт з'яўляўся прадметам спецыяльных гістарычных даследаванняў ужо ў пачатку 1980-х. Хаця і пасля гэтага спатрэбілася амаль 10 гадоў для таго, каб германскія гісторыкі знайшлі ў сабе сілу адысці ад традыцыйных уяўленняў аб ролі вермахта ў другой сусветнай вайне і пачалі шукаць пацвярджэнні не толькі гераізму ўзброеных сіл трэцяга рэйха, але і яго злачынстваў.

Наш разгляд будзе няпоўным, калі не згадаць думку Р.-Д. Мюлера і Г. Р. Юбершэра пра сучаснае тлумачэнне і пераасэнсаванне мінулага, што магчыма толькі ў кантэксце сістэмы адэкватных ацэнак, падыходаў, уяўленняў і г. д., а таксама пры звароце да альтэрнатыўных навуковых прынцыпаў. Як паказвае прыклад з вермахтам, новыя ацэнкі ў дачыненні да апошняга сталі магчымымі дзякуючы нетрадыцыйнаму навуковаму падыходу да гэтай гістарычнай, а не ідэалагічнай праблемы, спробе даследчыкаў знайсці тыя навуковыя абгрунтаванні, якія з'яўляюцца адэкватнымі гістарычнай рэчаіснасці і дакументальным крыніцам.

Разгляд сітуацыі з новымі германскімі даследаваннямі на тэму акупацыйнай палітыкі ў Беларусі прывёў Р.-Д. Мюлера і Г. Р. Юбершэра да думкі аб недахопе крытычнага падыходу пры вывучэнні любой гістарычнай праблемы, асабліва той, якая па тых ці іншых прычынах раней знаходзіла аднабаковае ці павярхоўнае асвятленне. У значнай ступені гэта датычыцца літаратуры, якая да 90-х гадоў, як адзначаюць сучасныя германскія навукоўцы, выдавалася ў СССР і ГДР [12, с. X]. Такая сітуацыя ў гэтых краінах стала магчымай у выніку таго, што гісторыкі не лічылі нормай прытрымлівацца залатога правіла навукі — захоўваць пры любых умовах навуковыя падыходы ў дычыненні да кожнага гістарычнага факта, падзеі, з'явы і г. д. Таму значная частка былой савецкай камуністычнай гістарыяграфіі імі аднесена да работ, якія змяшчалі скажоныя тлумачэнні, не мелі навуковых пацвярджэнняў, крытычнага аналізу дакументаў [12, с. XI] і інш. Невыпадкова, што ў аснову сваёй работы аўтары паклалі як толькі правераную часам і практыкай традыцыйную, так і новую англа- і нямецкамоўную літаратуру.

Звернем увагу на яшчэ адну акалічнасць, выказаную аўтарамі выдання ў дачыненні да ступені распрацоўкі тэматыкі па гісторыі акупацыйнага рэжыму ўвогуле і акупацыі Беларусі ў прыватнасці. Нямецкія гістарыёграфы адзначаюць той факт, што шмат якія тэмы па сённяшні дзень чакаюць сваіх даследчыкаў, напрыклад:

1) пакуль застаецца малаасветленай роля міністэрства Розенберга на апошнім этапе існавання акупацыйнага рэжыму на занятых усходніх тэрыторыях, у тым ліку ў Беларусі [12, с. 316];

2) адсутнічаюць спецыяльныя даследаванні з аналізам нацысцкай акупацыйнай палітыкі ў святле новых падыходаў і дакументальных крыніц [12, с. 317];

3) недастаткова адлюстравана ў навуковых крыніцах тэма дзейнасці ваеннай адміністрацыі, што зусім незразумела, як заўважаюць Р.-Д. Мюлер і Г. Р. Юбершэр, па прычыне таго, што большая частка акупаванай тэрыторыі СССР і Беларусі знаходзілася якраз у зоне дзейнасці вермахта і яго службаў [12, с. 319];

4) асаблівай адказнасці патрабуе вывучэнне гісторыі партызанскай вайны, прычым без перабольшвання яе ваенных і гераічных аспектаў, а таксама без уліку традыцыйных падыходаў камуністычнага мінулага [12, с. 321];

5) гісторыкам краін былога СССР неабходна адысці ад тых пануючых легенд, якія стварыла вакол сябе камуністычная партыя як арганізатар усенароднай барацьбы супраць фашысцкіх акупантаў [12, с. 322];

6) патрабуе пераасэнсавання і ваенная гісторыя краін былога СССР, аднак пад вуглом гісторыі вайны ці гісторыі людзей, іх будзённага жыцця ва ўмовах акупацыі [12, с. 320];

7) цяжка ўявіць сабе прычыны, па якіх у гэтых краінах адсутнічаюць фундаментальныя даследаванні аб лёсе ваеннапалонных і остарбайтэраў [12, с. 322] і інш. Апрача таго, аўтары гістарыяграфічнай працы сцвярджаюць, што на сённяшні дзень яны пакуль не выявілі фактаў інтэнсіўнай распрацоўкі большасці з гэтых праблем [12, с. 323].

Значны інтарэс у апошні час знайшло пытанне аб эканамічных аспектах нямецкай агрэсіі супраць Савецкага Саюза і іх адлюстраванні ў нацысцкай акупацыйнай палітыцы. Да 1991 года, як адзначаюць Р.-Д. Мюлер і Г. Р. Юбершэр, у пераліку навуковых прац адсутнічала даследа-

ванне, з якога можна было б скласці агульнае ўяўленне аб ваенна-эканамічнай гісторыі нацысцкага акупацыйнага рэжыму на Усходзе [12, с. 324]. Асэнсаванне таго, што ўжо з плана «Барбаросы» ў значнай ступені вынікалі эканамічныя моманты вайны, прывяла аўтара выдання «Deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten» да думкі аб асаблівай вартасці эканамічных задач у вайне Гітлера на Усходзе. З апублікаваных матэрыялаў вынікала, што ў шматлікіх працах германскіх навукоўцаў і раней закранаЛі пытанні эканамічнай палітыкі, адзначалі іх важнасць для даследавання гісторыі акупацыйнага рэжыму, аднак карысталіся пры гэтым традыцыйным падыходам і таму разглядалі эканамічныя пытанні ва ўзаемасувязі з палітычнымі аспектамі. Толькі з выданнем гэтай новай працы, укладальнікам якой з'яўляецца адзін з сааўтараў рэцэнзуемага выдання, менавіта Р.-Д. Мюлер, быў створаны надзейны фундамент для асобных навуковых прац [12].

Самая значная з іх, выкананая ў кантэксце новых навуковых падыходаў, — даследаванне берлінскага гісторыка Хрысціяна Герлаха «Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944» (Hamburg, 1999) — праца, якая ў 2000 годзе нямецкім часопісам «Damals» («У тыя часы». — *С. Н.*) была вызначана лепшай сярод фундаментальных даследаванняў у галіне гістарычнай навукі ФРГ [2]. Яно цалкам прысвечана нямецкай эканамічнай палітыцы і палітыцы вынішчэння ў Беларусі ў гады акупацыі. Калі апошняя частка назвы не выпадае з традыцыйнай схемы, дык першая прымушае звярнуць увагу якраз на адно з ключавых пытанняў дзейнасці нямецкага акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі — эканамічную дзейнасць ваеннай і цывільнай адміністрацыі па гаспадарчым рабаванні краю [7].

Навіна падыходу Х. Герлаха вызначаецца глыбокім і прынцыповым пераасэнсаваннем сутнасці нямецкай эканамічнай палітыкі, якую ваенная і цывільная адміністрацыі ў гады акупацыі праводзілі ў адпаведнасці з дырэктыўнымі ўказаннямі вышэйшага кіраўніцтва нацысцкай Германіі, з улікам планаў, праграм, заданняў па эканамічнай эксплуатацыі сельскай гаспадаркі, прамысловай вытворчасці, прымусовага выкарыстання мясцовай працоўнай сілы, у тым ліку ваеннапалонных. Такія захады акупацыйнага рэжыму па эканамічным рабаванні тэрыторыі і эксплуатацыі насельніцтва Х. Герлах тлумачыць тым фактам, што з лістапада 1941 г. нямецкая ваенная эканоміка ў сувязі з крахам планаў маланкавай вайны разглядала акупаваную тэрыторыю Беларусі як важны аб'ект новай каланіяльнай эканомікі на Усходзе [7, с. 196]. Аднак эканамічныя аспекты дзейнасці службаў вермахта, войскаў СС, паліцыі, а таксама адпаведных цывільных службаў генеральных і акруговых камісарыятаў берлінскі гісторык разглядае ў кантэксце трохгадовага існавання ўсёй сістэмы акупацыйнага рыжыму і прыходзіць да высновы, што ні адну краіну другая сусветная вайна не закранула так моцна, як Беларусь [7, с. 11].

На акупаванай тэрыторыі, тым не менш, германскія даследчыкі выяўляюць факты на карысць існавання «ваеннага грамадства» з шэрагам самых розных жыццёвых сфер, у цэнтры якіх ішла адчайная барацьба людзей за сваё выжыванне [12, с. 320].

Такім чынам, у 90-я гады германскай гістарыяграфіяй была вырашана адна з самых складаных задач па пераасэнсаванні гісторыі вайны Гітлера на Усходзе ўвогуле і гісторыі нацысцкай акупацыі Беларусі ў прыватнасці. Комплексны разгляд усяго гэтага зараз магчымы дзякуючы знаёмству з матэрыяламі толькі аднаго (з сямі. — *С. Н.*) раздзела [12, с. 1—142] рэцэнзуемага выдання Р.-Д. Мюлера і Г. Р. Юбершэра. Новыя падыходы, вызначаныя аўтарамі на прыкладзе крытычнага аналізу сусветнай гістарыяграфіі, даюць магчымасць, на наш погляд, наблізіць і беларускіх гісторыкаў да ўкаранення сучаснага вопыту ў працэс вывучэння айчыннай гісторыі.

## Літаратура

1. Б о р о з н я к А. И. «Так разрушается легенда о чистом вермахте...» // Отечественная история. 1997. № 3. С. 107—120.

2. Н о в і к а ў С. Лепшая кніга па гісторыі — пра Беларусь // Звязда. 2001. 7 жн.

3. C h i a r i B. Alltag hinter der Front: Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weissrussland 1941—1944. Duesseldorf, 1998.

4. Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. Bd. 4: Der Angriff auf die Sowejtunion / hrsg. vom Militaergeschichtl. Forschungsamt. Stuttgart, 1987.

5. Eine Ausstellung und ihre Folgen: Zur Rezeption der Ausstellung «Vernichtungskrieg. Verbrechen der Wehrmacht 1941 bis 1944». Hamburg, 1999.

6. Einsatz im «Reichskommissariat Ostland»: Dokumente zum Voelkermord im Baltikum und in Weissrussland 1941—1944 / hrsg. von *Wolfgang Benz, Konrad Kwiet, Juergen Matthaeus.* Berlin: Metropol, 1998.

7. G e r l a c h Ch. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 2000.

8. H e e r H., N a u m a n n K. Vernichtungskrieg. Verbrechen der Wehrmacht 1941 bis 1944. Hamburg, 1995.
9. K o h l P. Der Krieg der deutschen Wehrmacht und der Polizei 1941—1944. Frankfurt a. M., 1994.
10. L e n h a r d H. «Lebensraum im Osten»: Deutsche in Belorussland 1941—1944. Duesseldorf, 1991.
11. M i c h a e l i s R. Das SS-Sonderkommando Dirlewanger: ein Beispiel deutscher Besatzungspolitik in Weissrussland. Berlin, 1998.
12. M u e l l e r R.-D., U e b e r s c h a e r G. R. Hitlers Krieg im Osten 1941—1945. Ein Forschungsbericht. Darmstadt, 2000.
13. Verbrechen der Wehrmacht. Dimensionen des Vernichtungskrieges 1941—1944: Begleitbroschuere zur Ausstellung / hrsg. Hamburger Institut fuer Sozialforschung. Hamburg, 2001.

*S. Ya. NOVIKAW*

## MODERN GERMAN HISTORIOGRAPHY ON NAZI OCCUPATION OF BELARUS

**Summary**

New methodological approaches and results in interpreting the problem of Nazi occupation of Belarus (1941—1944) in modern German historiography are shown.